***В.А. Касап,*** *прафесар*

# ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА СПЕЦЫЯЛІСТА НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ СФЕРЫ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Глабалізацыя – гэта аб’ектыўная з’ява, якая характэрна для ўсіх бакоў жыццядзейнасці чалавека, дзяржавы, планеты. Аб глабалізацыі як прынцыпова новым падыходзе да пабудовы свету пачалі пісаць у канцы XX ст., а ў 2000 г. ёй прысвечана Хартыя глабальнага інфармацыйнага грамадства (Акінава), прынятая главамі васьмі вядучых краін свету. Як адзначае В.А.Міхайлаў, “глабалізацыя – гэта станаўленне агульнасусветнай фінансава-эканамічнай прасторы рынку; постіндустрыяльная стадыя развіцця краін і з’яўленне сусветнай інфармацыйнай прасторы на базе найноўшых камп’ютэрных і медыятэхналогій; спробы распаўсюджвання адзінай сістэмы каштоўнасцей; універсалізацыя свету” [1, с. 12]. Сутнасць глабалізацыі заключаецца ў значным узмацненні ўзаемасувязей і ўзаемазалежнасці ўсіх суб’ектаў.

Аб’ектыўным тэхналагічным дасягненнем глабалізацыі з’яўляецца інфарматызацыя, якая зрабіла даступнымі для чалавецтва ўсе пласты культуры, усе тэхналагічныя дасягненні. В.М.Астаф’ева адзначае, што “асноўнымі кірункамі развіцця эпохі глабалізацыі выступаюць інфарматызацыя, віртуалізацыя, медыятызацыя, а асноўнымі яе характарыстыкамі становяцца не стандартызацыя і уніфікацыя, а магчымасць выбару разнастайных, рознанакіраваных напрамкаў развіцця дзейнасці” [2, с. 16]. Адной з умоў глабалізацыі, такім чынам, з’яўляецца фарміраванне інфармацыйнай прасторы, якая вызначаецца як форма грамадскага існавання, звязаная з дзейнасцю суб’екта. Тэрмін “інфармацыйная прастора” ўзяты сацыяльна-гуманітарнымі навукамі з фізікі, дзе абазначае магчымасць суіснавання розных з’яў і фактараў. У межах кібернетычнага падыходу інфармацыйная прастора – гэта сукупнасць крыніц інфармацыі, баз даных, а таксама сетак і тэхналогій, якія іх аб’ядноўваюць.

Дзейнасць суб’екта ў межах інфармацыйнай прасторы накіравана на выкананне прафесійных абавязкаў у адпаведнасці з характарам і ўзроўнем атрыманай адукацыі і прафесійнай кампетэнцыі. Мы можам гаварыць аб дзейнасці спецыялістаў у сферы “навука”, сферы “тэхніка” (гэта значыць праектавання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канструявання), сферы “вытворчасць”, у працэсе якой ствараецца прадукт ці паслуга, сферы “спажыванне” (выкарыстанне створанага прадукту). У інфармацыйнай прасторы спецыяліста інтэгруюцца віды прафесійнай дзейнасці і функцыі, якія яе рэалізуюць. Дзейнасць спецыяліста прадугледжвае як выкананне ім функцыянальных абавязкаў, так і яго ўключанасць у сістэму міжасобасных, культурна-адпачынкавых, адукацыйных і іншых зносін у арганізацыі. Менавіта тут фарміруецца асабістая інфармацыйная прастора спецыяліста, дзе канцэнтруюцца яго жыццёвыя, сацыяльна-псіхалагічныя і іншыя каштоўнасці. У літаратуры разглядаюцца такія віды прасторы асобы, як псіхалагічная, гуманітарная, аксеалагічная, культурна-адукацыйная, прафесійна-адукацыйная, тэхналагічная і інш. Крытэрыем для выдзялення інфармацыйнай прасторы ў асобную можа з’яўляцца яе дамінаванне ў сферы грамадскага жыцця, дзе яна функцыянуе і развіваецца.

Інфармацыйная прастора з пазіцыі камунікацыйнага падыходу ўяўляе сукупнасць камунікацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць узаемадзеянне паміж стваральнікам, распаўсюджвальнікам і карыстальнікам інфармацыі. У структуры інфармацыйнай прасторы выдзяляюць узроўні *глабальны*, *лакальны* і *асабісты*, якія ахопліваюць ўсе сферы грамадскага жыцця і прафесійнай дзейнасці спецыяліста. У літаратуры [2; 5] вызначаюцца ўласцівасці інфармацыйнай прасторы: *унікальнасць* (адсутнасць аналагаў па ступені ахопу і магчымасці звароту да масавай аўдыторыі); *адкрытасць* (патэнцыяльная магчымасць любога спецыяліста з’яўляцца як карыстальнікам інфармацыйных рэсурсаў, так і іх вытворцам і транслятарам); *глабальнасць* (адсутнасць нацыянальных ці якіх-небудзь іншых спосабаў дыскрымінацыі людзей па ступені доступу да інфармацыі); *нелінейнасць* (альтэрнатыўнасць і шматварыянтнасць шляхоў развіцця глабальных інфармацыйных рэсурсаў у цэлым, а таксама асобных іх сегментаў); *складанасць* (наяўнасць значнай колькасці звязаных камунікатыўных каналаў, якія з’яўляюцца альтэрнатыўнымі крыніцамі інфармацыі); *інтэграванасць* (узаемасувязь асобных элементаў інфармацыйных рэсурсаў у адзінае цэлае).

Паняцце “інфармацыйна-камунікацыйная прастора” ў афіцыйнай, навуковай і навукова-метадычнай літаратуры трактуецца пераважна як прастора, дзе з дапамогай інфармацыйных тэхналогій распаўсюджваецца інфармацыя. Але галоўная задача ўкаранення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных тэхналогій – устанаўліваць кантакты паміж членамі грамадства, наладжваць прафесійныя, адукацыйныя, культурныя зносіны паміж людзьмі, а не толькі распаўсюджваць інфармацыю. Такім чынам, інфармацыйная прастора выконвае сваю галоўную функцыю – камунікатыўную. Адпаведна прастора, дзе адбываецца кантакт спецыяліста і інфармацыі, будзе інфармацыйна-камунікацыйнай. У эпоху адкрытага інфармацыйнага грамадства і глабалізацыі менавіта бібліятэкі становяцца цэнтральным звяном сістэмы сацыяльна-культурных камунікацый і трансліравання ведаў.

Адной з асаблівасцей прафесійнай дзейнасці ў навукова-тэхнічнай сферы з'яўляецца прасторавая разгрупаванасць спецыялістаў, калі прадукт можа праектавацца ў адной краіне (прычым члены канструктарскага калектыву могуць фізічна знаходзіцца ў розных гарадах), праходзіць выпрабаванні ў іншых дзяржавах, а вырабляцца прамысловым спосабам у трэціх краінах. У распаўсюджванні навукова-тэхнічных ведаў не існуе тэрытарыяльных і моўных абмежаванняў. У такіх умовах асобую значнасць набывае магчымасць аўтаматызаванага дакументавання інтэлектуальнай уласнасці, а таксама выкарыстання ўсёй сукупнасці сусветных інфармацыйных рэсурсаў, якую можа даць бібліятэка. Так, дзякуючы размешчанаму на сайце бібліятэкі электроннаму каталогу магчымы атрыманне інфармацыі аб наяўнасці пэўных дакументаў, працяг карыстання тымі з іх, якія ўжо былі заказаны, значна спрашчаецца атрыманне дакументаў па МБА. Сайт бібліятэкі становіцца асноўным каналам доступу да глабальнай інфармацыйнай прасторы. Спасылкі на ўласныя дакументныя рэсурсы бібліятэкі, даступныя ў электроннай форме, а таксама рэсурсы іншых бібліятэк ператвараюць сайт у адзін з вузлоў сучаснага навуковага і культурнага гіпертэксту, што важна пры ажыццяўленні інфармацыйнага суправаджэння дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм. Спецыяльныя бібліятэкі распрацоўваюць і онлайнавыя даведнікі па рэсурсах Інтэрнэта, ствараюць разгалінаваную сетку спасылак, якія спрашчаюць доступ да інфармацыйных рэсурсаў розных відаў і правядзенне іх пошуку. Акрамя электронных каталогаў, баз даных, бібліятэкі размяшчаюць у сетцы і ўласныя выданні арганізацыі: навуковыя, даведачныя, матэрыялы канферэнцый, што часта робяць бібліятэкі ВНУ. Такім чынам, інфармацыйна-камунікацыйная прастора спецыяліста навукова-тэхнічнай сферы ва ўмовах глабалізацыі фарміруецца пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непасрэдным удзеле спецыяльнай бібліятэкі, якая звязвае аддаленых распрацоўшчыкаў і карыстальнікаў інавацыйнай прадукцыі.


*1. Михайлов, В.А.* Глобализация – объективный фактор развития современного мира / В.А.Михайлов // Вестник БАЕ. – 2004. – № 2. – С. 12–16.

*2. Астафьева, О.Н.* Медиакультура и некоторые принципы формирования информационно-коммуникационного пространства / О.Н.Астафьева // Вестник БАЕ. – 2008. – № 4. – С. 16–25.

*3. Ненашев, А.И.* Информационное пространство современного общества: коммуникационный аспект: автореф. дис. … канд. филос. наук / А.И.Ненашев. – Саратов, 2008. – 16 с.

*4. Каптерев, А.И.* Информатизация социально-культурного пространства / А.И.Каптерев. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2004. – 512 с.

*5. Берестова, Т.Ф.* Информационное пространство библиотеки: науч.-метод. пособие / Т.Ф.Берестова. – Либерея-Бибинформ, 2007. – 240 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ